Антибашистская газета

Башизм - «Репрессивный режим, направленный на подавление прогрессивных общественных движений, на уничтожение демократии».

С.И.Ожегов, «Толковый словарь руского языка», на букву «Ф»

Горецкий Выбор


Спецвыпуск
Февраль 2007г.

Зажги свою свечу

Шестнадцатого февраля по всей Беларуси пройдет очередная акция солидарности с семьями пропавших политиков и находящимися сегодня в тюрьмах политзаключенными. В этот раз к ней присоединятся и горецкие жители.



Юрий ЗАХАРЕНКО



Анатолий КРАСОВСКИЙ



Виктор ГОНЧАР



Дмитрий ЗАВАДСКИЙ

Идея проводить Дни солидарности родилась после того, как 16 сентября 2005 года в годовщину исчезновения вице-спикера Верховного Совета Виктора Гончара и бизнесмена Анатолия Красовского в Минске была разогнана акция памяти исчезнувших политиков. Люди в этот момент держали в руках портреты генерала Юрия Захаренко и журналиста Дмитрия Завадского.

Новая волна репрессий бросила за решетку известных политических лидеров. Александр Козулина (5,5 лет), Дмитрия Дашкевича (лидер «Молодого фронта», осужден на 1, 5 года по статье УК, принятой накануне президентских выборов-2006 за участие в работе незарегистрированной организации, отбывает наказание в шкловской колонии).

Акции солидарности проводятся в Беларуси и по всему миру в 16-й день каждого месяца. Тысячи белорусов и друзей нашего народа во всем мире в 20.00 зажигают в своих окнах свечи Свободы, проводят различные акции солидарности. В храмах по всему свету проходят молебны за белорусских политзаключенных, за семьи пропавших людей, за всех, кто борется за свободу и демократию в Беларуси.

Солидарность с Беларусью высказывают не только простые люди, но и парламентарии, руководители многих стран, известные политики.

Присоединяйтесь!

Чтобы принять участие в акции, нужно в пятницу, 16-го февраля, в 20.00. выключить свет в одной из комнат и зажечь на окне свечу. Сколько времени она будет гореть — решите Вы сами. Этим Вы сможете выразить солидарность с семьями исчезнувших белорусов, поддержать политзаключенных.

Важно, что при этом не нарушается ни один из ныне действующих белорусских законов.

Акцыі салідарнасьці праходзяць у Менску...

Тысячы свечак запальвалі 16 снежня па ўсім свеце ў знак салідарнасці з беларускімі палітвязнямі, сем'ямі зніклых, рэпрэсаванымі і з тымі, хто змагаецца за свабоду і дэмакратыю ў Беларусі. У Менску ў гэты дзень сотні людзей выйшлі на вуліцы. 100 чалавек роўна ў 18.00 запалілі свечкі на плошчы Незалежнасці, дзясяткі людзей прыйшлі да дома экс-кандыдата ў прэзідэнты Беларусі, палітвязня Аляксандра Казуліна на Нямізе і запалілі свечкі салідарнасці з ягонымі сваякамі. Свечкі ў гэты дзень гарэлі ля кінатэатра "Кастрычнік", Нацыянальнай бібліятэкі, Цэнтральнага чыгуначнага вакзалу і ў іншых раёнах Менска. Транспаранты, якія заклікалі вызваліць палітвязняў, былі вывешаныя ў шматлікіх частках горада. Дзень салідарнасці адзначылі ў Віцебску, Гародні, Гомелі, Салігорску, Барысаве, Берасці, Магілёве і ў іншых гарадах Беларусі. Тысячы беларусаў запальвалі свечкі Свабоды і Салідарнасці ў вокнах сваіх дамоў. У шматлікіх краінах свету пікетавалі беларускія дыппрадстаўніцтвы і праводзілі акцыі салідарнасці. 17 маладзевых актывістаў былі затрыманыя ў гэты дзень у Менску падчас мірных акцый у розных раёнах горада. Праз некалькі гадзін пасля затрымання ўсе яны былі вызваленыя. Арыштоўвалі і затрымоўвалі актывістаў у іншых гарадах краіны. Актывіст Саюза палякаў Станіслаў Пачобут правёў сёння ноч у спецпрыёмніку-размеркавальніку. Выхад на плошчу са свечкай супрацоўнікі міліцыі расцанілі як «хуліганства». Акцыі салідарнасці з Беларуссю прайшлі ў Бельгіі, Літве, Украіне, Расеі, Польшчы, Эстоніі, Швецыі, ЗША і іншык краінах свету.

Улас.інф.

Радыё «Свабода»

панядзелак, 12 лютага 2007, 15:51

У Варшаве адбыўся пікет салідарнасьці з палітвязьнямі Беларусі

Сёньня ў Варшаве пачаўся "Тыдзень салідарнасьці з палітвязьнямі Беларусі". Група беларусаў пад кіраўніцтвам Ігара Крыштона мае намер цягам 5 дзён рабіць пікеты ў розных месцах польскай сталіцы на знак салідарнсьці з палітвязьнямі.

Першы пікет адбыўся сёньня каля амбасады Беларусі. Гаворыць Ігар Крыштон.

Крыштон: "Сёньня мы пачынаем акцыю тыдзень салідарнасьці з палітвязьнямі Беларусі. Мы хочам выказаць падтрымку тым, хто застаўся ў Беларусі і трапіў за краты, тым, хто выходзіць на плошчы, каб яны адчувалі нашу маральную падтрымку. Хочам таксама паказаць міжнароднай супольнасьці, што адбываецца ў Беларусі".

Прысутныя трымалі, сярод іншага, бел-чырвона-белыя сьцягі, партрэт Аляксандра Казуліна, плякаты з надпісамі "Свабоду палітвязьням!".

Аляксей Дзікавіцкі, Варшава

BELNGO.INFO

Адзначэньне Дня беларускай салідарнасьці ў Магілёве набыло свой устойлівы фармат

Прыкладна зь сярэдзіны мінулага году магілёўскія дэмакраты 16 числа кожнага месяца ўпарта ладзяць маўклівыя акцыі на Дзень беларускай салідарнасьці. Вось і ўчора 15 актывістаў хадзілі з запаленымі сьвечкамі й партрэтамі зьніклых і зьняволеных беларускіх палітыкаў у цэнтры абласнога цэнтру на знакамітай ужо пешаходнай вуліцы.

Ізноў, як гэта адбываецца ўжо цягам некалькіх апошніх месяцаў, іх шчыльна і маўкліва суправаджала група амонаўцаў ды міліцыянтаў. Мясцовыя праваабаронцы зьвязваюць такі незвычайны фармат правядзеньня Дня салідарнасьці з пераменамі, якія адбыліся апошнім часам у адносінах паміж міліцыяй і дэмакратамі. Раней міліцыя перашкаджала акцыям і затрымлівала ўдзельнікаў, а нават і перадавала пратаколы на іх на разгляд адміністратыўных камісіяў. Але ж і дэмакраты ў сваю чаргу кожны раз праз суд аспрэчвалі свой перасьлед. Міліцыянтам такім чынам даводзілася зьяўляцца у суд й даваць свае тлумачэньні. Гэта для міліцэйскага начальства заўсёды было вельмі непрыемна, нязвыкла і нязручна — нават і пры тым, што ніводзін суд ніводнага разу не прызнаў рацыі дэмакратаў.

Аднак, магчыма, што з-за прынцыповасьці дэмакратаў, якую яны настойліва шукалі ў судзе, цяпер у Магілёве ім дазваляюць праводзіць тыя альбо іншыя сьціплыя па фармату пратэстныя акцыі, на якіх не бывае прамоваў альбо раздачы ўлётак. Міліцыя назірае за гэтымі акцыямі, фіксуе іхных удзельнікаў, але на больш рашучыя меры пакуль не ідзе. Варта дадаць, што цягам правядзеньня апошняй акцыі, якая скончылася без эксцэсаў і затрыманьняў, многія мінакі атрымалі ад яе ўдзельнікаў падрабязныя адказы на свае пытаньні аб тым, што і з якой мэтай тут адбываецца, чаму людзі трымаюць запаленыя сьвечкі ў руках і чыёй свабоды патрабуюць.

Віктар ВОЙТ

BELNGO.INFO

Дзень салідарнасьці ў Бабруйску ледзь не закончыўся затрыманьнямі

18 студзеня

Гэтым разам Дзень беларускай салідарнасьці ў Бабруйску ледзь ня скончыўся затрыманьнямі. Як заўсёды, людзі сталі падыходзіць у 18 гадзін пад капліцу ля Менскіх могілак. Адразу пасьля пачатку акцыі зьявіліся прадстаўнікі МУС, якія пачалі распытваць, чаму людзі стаяць з запаленымі сьвечкамі. Паводле словаў адной з удзельніц мерапрыемства, актывістам прапанавана было разысьціся, а для большай пераканаўчасьці прад'ехаў міліцэйскі мікрааўтобус. Удзельнікам акцыі памяці ўдалося прастаяць 20 хвілінаў, пакуль ішлі перамовы зь міліцыяй, пасьля чаго яны вырашылі разысьціся. Акцыі салідарансьці са зьніклымі палітыкамі праходзяць у Бабруйску ўжо год. Раней міліцыя ставілася да такога стаяньня спакойна, хаця заўсёды кантралявала, праяжджаючы міма на міліцэйскай машыне.

Аляксей МАНАКІН

«Гоецкий выбор», спецвыпуск
Издатель и главный редактор
Эдуард БРОКАРЕВ
Тираж 299 экз.